# Старажытная Фінікія

## Урок гісторыі, V клас

**А. Г. Пляўга,** настаўніца гісторыі і грамадазнаўства навучальна-педагагічнага комплексу «Рытанскі дзіцячы сад — сярэдняя школа» Астравецкага раёна

Мэты:

- стварыць умовы для вывучэння прыродных умоў Фінікіі, заняткаў насельніцтва, адкрыццяў фінікійцаў;
- развіваць увагу, уменне параўноўваць, аналізаваць, разважаць;
- выхоўваць павагу да мінулага.

Тып урока: камбінаваны (праверка дамашняга задання і вывучэнне новага матэрыялу).

Абсталяванне: карта «Егіпет і Пярэдняя Азія», мультымедыйная ўстаноўка, музычнае суправаджэнне.

### Ход урока

*I. Арганізацыйны момант.*

*II. Праверка дамашняга задання.*

Настаўнік. Сёння нас чакае захапляльнае падарожжа ў адну вельмі цікавую краіну, куды мы адправімся са старажытнай краіны, з якой пашанцавала пазнаёміцца. Яна мае назву __________ (*дзеці адказваюць*) **і яшчэ раз замацуем атрыманыя веды па вывучанай тэме.**

***Вучань падыходзіць да дошкі і выконвае заданне — «Суаднесці»:***

| | |
|---|---|
| Іран | Старажытная дзяржава Ірана |
| Элам | Краіна арыяў |
| Зараастр | Свяшчэнная кніга рэлігіі старажытных іранцаў |
| Авеста | Аўтар асновы «Авеста» |

— На дошцы прымацавана кветачка, на яе пялёстках схаваны пытанні, на якія нам патрэбна адказаць, і заданні.

- З дапамогай карты апішыце месцазнаходжанне Ірана і прыродныя ўмовы краіны.
- Хто такія арыі?
- Чым займаліся арыі?
- Назавіце найстаражытнейшую дзяржаву на тэрыторыі Ірана. Кім яна была заваявана?
- **Якое кіраўніцтва было ў Персідскай дзяржаве?**
- **Назавіце вярхоўнага бога Ірана. Якая свяшчэнная кніга іранцаў?**

**— Каб даведацца, куды мы будзем адпраўляцца, мы выканаем заданне — «Адгадай крыжаванку»:**




1. Цар старажытнага Егіпта. (**Фараон.**)
2. Краіна, якая ў перакладзе азначае «Краіна арыяў». (**Іран.**)
3. Найстаражытнейшая пісьменнасць шумераў. (**Клінапіс.**)
4. Плямёны, якія ў III тысячагоддзі да н. э. рассяліліся паміж Дняпром і Уралам. (**Арыі.**)
5. Сталіца царства акадцаў. (**Акад.**)
6. Персідская дзяржава падзелена на вобласці, якія называліся _____. (**Сатрапія.**)
7. Навука, якая вывучае жыццё людзей у мінулым. (**Гісторыя.**)

— Мы з вамі адгадалі зашыфраванае слова, якое і стане нашым наступным пунктам падарожжа.

***III. Вывучэнне новага матэрыялу.***

**— А зараз адправімся ў мінулае, у старажытную краіну Фінікію, якой, праўда,**

gisdapamoga.by

ужо няма на карце. Зараз тут размешчана дзяржава Ліван.

Запішыце тэму ў сшытку. Якія ў вас жаданні, надзеі на падарожжа? Што вас больш за ўсё цікавіць? *(Адказы вучняў.)*

— Любому падарожніку, які ўпершыню прыбывае ў краіну, цікава, якія там кліматычныя ўмовы, як жывуць людзі, чым яны займаюцца, якія найбольшыя гарады-дзяржавы. Сёння мы будзем параўноўваць развіццё Фінікіі з развіццём іншых старажытных краін.

— Ці ведаеце вы, адкуль пайшла назва Фінікія? (*Адказы вучняў.*) А дапаможа нам у гэтым скрыначка з сакрэтамі. (*Вучні зачытваюць 2 версіі паходжання назвы*). Версіі:

1. Слова «Фінікія» паходзіць ад грэчаскага «фойнікес» — «пурпурныя людзі».

Пурпурнай фарбай вельмі славіліся фінікійцы. Адзенне, пафарбаванае ў гэты колер, каштавала вельмі дорага, яго насіць маглі толькі багатыя людзі.

2. Назва «Фінікія» паходзіць ад егіпецкага слова «фенеху» — караблебудаўнікі.

— Менавіта караблямі славіліся фінікійцы ва ўсім свеце, амаль усё іх жыццё было звязана з морам.

Цікава! Самі фінікійцы лічылі, што назва іх краіны ўтварылася ад двух назваў, якімі яны назвалі сваю радзіму і новыя адкрытыя землі:
1. Асу — усход; 2. Эрэб — заход.

— Мы выбралі марское падарожжа. Зойдзем усе на «карабль» і «паплывём». Нас чакае шмат прыемных і цікавых сюрпрызаў. Першы прыпынак — «Старажытная карта». На «караблі» мы знайшлі карту, якую павінны вывучыць, каб не заблудзіцца. Але карта крыху пашкоджана, таму мы павінны яе аднавіць. Краіна Фінікія знаходзілася на ўсходнім узбярэжжы Міжземнага мора. Ад астатняй Пярэдняй Азіі яна была агароджана гарамі з кедравымі і змешанымі лясамі, альпійскімі пашамі і снежнымі вяршынямі. З захаду яе абмывалі цёплыя воды Міжземнага мора. З вільготнымі вятрамі прыходзілі дажджы. Усё жыццё фінікійцаў было звязана з Міжземным морам. Пазначце яго на карце. Цяпер успомнім, чым адрозніваюцца кліматычныя ўмовы Фінікіі ад клімата Егіпта, Міжрэчча.

— Як вы думаеце, ці ўплываюць кліматычныя ўмовы на заняткі насельніцтва? Якія заняткі былі характэрны для фінікійцаў?

*Дзеці працуюць у парах. Выпісваюць з падручніка, якія былі заняткі ў фінікійцаў.*

*Фізкультхвілінка.*

— Наступны прыпынак — «Фінікійскія гарады-дзяржавы». Фінікія складаецца з некалькіх гарадоў-дзяржаў. А што такое горад-дзяржава? Буйныя гарады: Цір (скала), Бібл (гара), Бейрут і Сідон (у перакладзе азначае — месца для рыбнай лоўлі). Пазначце на карце гарады. Цэнтрам дзелавога жыцця быў порт, дзе загружаліся і разгружаліся караблі, якія прывозілі з Егіпта папірус, тканіны і золата, з Месапатаміі — гліняныя вырабы.

Пакуль мы будзем пераязджаць з аднаго горада ў другі, зазірнём у скрынку, якая змяшчае яшчэ адзін сакрэт. Ваша задача — даведацца, аб якім вынаходніцтве чалавецтва ідзе гаворка:

Аднойчы фінікійскі гандлёвы карабель, на якім вязлі соду, прыпыніўся да пясчанага берага. Купцы вырашылі паабедаць, расклалі вогнішча, дасталі кацялкі, але не знайшлі камяні, на якія можна было іх паставіць. Тады яны замест камянёў узялі кавалкі каменнай соды. Калі гатаваўся абед, купцы заўважылі, што на агні сода пачала плавіцца і, змешваючыся з пяском, ператварылася ў струмень празрыстай вадкасці. Што гэта за вадкасць? Якое вынаходніцтва? (**Шкло.**)

— Фінікійскія купцы гандлявалі па ўсім узбярэжжы Міжземнага мора, і паступова весь гандаль аказаўся ў руках фінікійцаў. Для зручнасці яны заснавалі калоніі (паселішчы). Найбуйнейшай з іх быў Карфаген («новы горад»).

— Наступны прыпынак — «Старажытны дакумент». Нам пашанцавала знайсці старажытны скрутак. Што вы тут бачыце? Гандаль патрабаваў вядзення хуткіх запісаў. Першапачаткова фінікійцы выкарыстоўвалі клінапіс.

Фінікійцы прыдумалі больш зручную сістэму пісьма. Кожны значок быў літарай і абазначаў асобны зычны гук, а не слова.

gisdapamoga.by

Фінікійскі алфавіт складаўся з 22 літар. Цікава ведаць: мы з вамі пішам злева направа, а фінікійцы — наадварот. Пазней грэкі дадалі да алфавіта і галосныя літары.

— А зараз мы пабываем на «Археалагічных раскопках». Вось дакумент таго часу, але вы бачыце, што ён пашкоджаны, і мы паспрабуем яго рэстаўраваць.

— Наша падарожжа завяршылася. Нягледзячы на тое, што краіны Фінікіі ўжо няма, памяць аб ёй жыве да сённяшніх дзён. Фінікійцам мы абавязаны назвай нашага кантынента — Еўропа. Так звалі, згодна з легендай старажытных грэкаў, дачку фінікійскага цара. Аднойчы Еўропа гуляла на беразе мора. Бог Зеўс, уражаны яе прыгажосцю, прыняў воблік белага быка і прапанаваў ёй праехацца з ім. Еўропа села на спіну быка, але той раптоўна кінуўся ў мора і хутка адплыў ад берага. Ён даплыў да вострава Крыт. Еўропа стала жонкай Зеўса і нарадзіла яму трох сыноў. Імем Еўропы сталі называць заходнюю частку Міжземнамор'я, а затым і ўвесь кантынент. Слова «Еўропа» перакладаецца як «заходзячае сонца».

***IV. Замацаванне.***

**1. Краіна, размешчаная на ўсходнім узбярэжжы Міжземнага мора:** а) Іран; б) Фінікія; в) Егіпет.

**2. Фінікійцы славіліся вырабам фарбы. Гэта:** а) пурпур; б) чорная; в) зялёная.

**3. Алфавіт фінікійцаў складаўся з ________ літар:** а) 11; б) 22; в) 23.

**4. Найбуйнейшая калонія Міжземнага мора:** а) Карфаген; б) Фівы; в) Сідон.

**5. Якому слову далі пачатак дзве літары «алеф» і «бэт»:** а) клінапіс; б) калонія; в) алфавіт?

**6. Буйны партовы горад, які ўзнік у III тыс. да н. э.:** а) Акад; б) Цір; в) Мемфіс?

**7. Фінікійцы праславіліся як умелыя будаўнікі. Што яны пабудавалі:** а) карабель; б) дом; в) дарогу?

**8. Фінікійцы першымі пачалі выраблясць:** а) штучнае арашэнне; б) шкло; в) клінапіс.

**9. Якая сучасная дзяржава размешчана на тэрыторыі Фінікіі:** а) Ліван; б) Беларусь; в) Індыя?

***V. Рэфлексія.***

Мне больш за ўсё запомнілася________________________________________.

Гэта асабліва мяне зацікавіла________________________________________.

Адно пытанне, якое мяне хвалюе________________________________________.

***VI. Дамашняе заданне:*** § 22. Прыдумайце герб Фінікіі.

# Горад у IX — сярэдзіне XIII стагоддзя

**Урок гісторыі, VI клас**

**А. Г. Пляўга**

Мэты ўрока:
- сфарміраваць агульнае ўяўленне аб сярэдневяковым горадзе, пазнаёміць са знешнім выглядам гарадоў, шляхамі ўзнікнення, роляй гарадоў у грамадскім жыцці;
- развіваць цікавасць да мінулага нашага краю, уменне вылучаць галоўнае ў матэрыяле, які вывучаецца;
- выхоўваць цікавасць да гістарычнага мінулага беларускай зямлі.

**Тып урока:** урок тлумачэння новага матэрыялу.

**Від урока:** камбінаваны з выкарыстаннем мультымедыйнай прэзентацыі.

**Абсталяванне:** Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да сярэдзіны XIII ст.: вучэб. дапам. для 6-га кл. агульнаадукац. устаноў з бел. мовай навучання / Г. В. Штыхаў, С. М. Цемушаў. — Мінск 2009; *Ракуць В. Р.* Нашы гарады / В. Р. Ракуць. — Мінск, 1990; карта Беларусі, карткі з заданнямі, мультымедыйны праектар, музычнае суправаджэнне.

gisdapamoga.by